*Т. А. Сапега*

# РЭЛІГІЙНАЯ КНІГА Ў ЭКСПАЗІЦЫІ МУЗЕЯ КНІГІ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ БІБЛІЯТЭКІ БЕЛАРУСІ

*Рэлігійная кніга ў шырокім яе вызначэнні з'яўляецца аб'ектам экспазіцый Музея кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і прадстаўлена ў ім як помнік кніжнай культуры, твор кніжнага мастацтва. Распавядаецца пра асобныя экзэмпляры музея, якія належаць да розных рэлігійных традыцый беларускай поліканфесіянальнай і шматэтнічнай культуры.*

У артыкуле паняцце «рэлігійная кніга» ўжываецца ў шырокім сэнсе і ўключае не толькі хрысціянскую кнігу, але і кнігі, якія ўзніклі ў межах іншых рэлігійных традыцый (будызм, іслам, іудаізм і інш.). Менавіта пералічаныя рэлігійныя светапогляды праз кніжныя помнікі прадстаўлены сёння ў экспазіцыі Музея кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі (далей: НББ).

Рэлігійная кніга ў Музеі кнігі НББ дэманструецца ў першую чаргу як помнік кніжнай культуры пэўнай эпохі. Гэта абумоўлена самой спецыфікай дзейнасці Музея кнігі НББ, які вывучае і прадстаўляе кнігу як помнік кніжнай культуры. Акрамя таго, важная асаблівасць музейнай інфармацыі звязана са знакавымі якасцямі музейнага прадмета. У музеі галоўным становіцца не функцыянальнае значэнне прадмета, а яго грамадскае значэнне як помніка гісторыі і культуры. Прадметы ў экспазіцыі трактуюцца як асаблівыя знакі, успрыманне і разуменне якіх складае сутнасць наведвання музея [1]. Кожная кніга, вырваная са свайго кантэксту, надзяляецца пэўным знакавым значэннем. У музеі кніга не раўнацэнная сама сабе, таму што яна нешта сімвалізуе і набывае значэнне вобраза-сімвала пэўнага часу [2, с. 37–38]. Напрыклад, змешчанае ў музейнай экспазіцыі Евангелле страчвае функцыянальнае значэнне богаслужбовай кнігі, якое яно мела ў асяроддзі бытавання – у храме. У экспазіцыі Евангелле набывае новае, грамадскае значэнне і ўспрымаецца як твор кніжнага мастацтва і сведчанне важнейшых рыс культуры свайго часу [3, с. 323–324].

Рэлігійныя кнігі маюць сваю адметную сімволіку культуры той эпохі, у якой яны былі створаны, і той канфесіі, да якой належаць (пра што падрабязна пісала даследчыца Т. А. Самайлюк [4]). У якасці сімволікі выступаюць мова, тып пісьма для рукапісаў,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

графіка шрыфту для друкаванай кнігі, форма, фармат, матэрыял, аздабленне апраквы, асаблівасці мастацкага афармлення і інш. У музеі сімвалы рэлігійных кніг з’яўляюцца тым умоўным апазнавальным знакам, што адлюстроўвае культуру рэлігійнай канфесіі, кніжную культуру і культуру пэўнай краіны таго ці іншага гістарычнага этапу.

У экспазіцыі Музея кнігі НББ дэманструюцца Торы, якія датуюцца канцом XVIII – першай паловай XIX ст. Комплекс сімвалаў, як матэрыял (пергамін), форма (скрутак) і мова (іўрыт), сведчыць пра прыналежнасць да іудзейскай рэлігійнай культуры. Гэтыя сімвалы расказваюць таксама пра асаблівасці беларускай культуры, яе поліэтнічнасць, шматмоўнасць і поліканфесіянальнасць. Торы на пергаміне ў гэты перыяд выраблялiся на тэрыторыі Беларусі ў ешыботах, якія існавалі ў Бярэсці, Міры, Валожыне, Лідзе, Слоніме, Слуцку і інш. У Музеі кнігі НББ Торы як аб’екты кніжнай культуры экспануюцца ў раздзеле «Формы і матэрыялы кніг», мэтай якога з’яўляецца дэманстрацыя разнастайнасці формаў кнігі і выкарыстаных матэрыялаў для яе стварэння. У гэтым жа раздзеле дэманструецца будыйская «Сутра», пераплеценая ў форме «матыля». Форма і матэрыял з’яўляюцца галоўнымі знакамі, якія адначасова былі крытэрыямі адбору і змяшчэння пералічаных рукапісаў у экспазіцыі.

Усходнія рэлігійныя рукапісныя кніжныя помнікі праяўляюць сябе праз сімволіку мовы, мастацкага афармлення апраквы і мастацкага афармлення рукапісу. Звычайна ўсе ўсходнія рукапісы маюць надзейныя скураныя так званыя футляры-вокладкі з клапанам. Сам скураны футляр упрыгожваўся залатым ціснѐным арнаментам расліннага характару або па-ўсходняму вытанчанай разеткай (пальметай). Для мастацкага афармлення ўласцівыя колеры сіні – нябесны і залаты – колер боскага святла, а таксама шматлікія іншыя асаблівасці.

У раздзеле «Мастацтва апраквы», мэта якога – паказаць разнастайнасць мастацкага афармлення апраквы, прадстаўлены ў тым ліку праваслаўныя і стараверскія рукапісы і старадрукі. Дэманструюцца скураныя на дрэве і кардоне апраквы, суцэльная металічная апраква, упрыгожаная накладной эмаллю, апраквы, упрыгожаныя накладнымі сярэднікамі і навугольнікамі, і інш. Сімваламі рэлігійнай культуры тут з’яўляюцца мастацкае афармленне апраквы і фармат. Вялікія па фармаце ў багатым афармленні пераважаюць Евангеллі напрастольныя, меншага фармату ў сціплым афармленні – кнігі для

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чытання. Выдзяляюцца стараверскія кніжныя помнікі, для якіх традыцыйным з'яўляецца ўпрыгожванне аправы васьміканцовым крыжам, выкананым з металу, з фігурамі біблейскіх персанажаў ля крыжа. Акрамя гэтага, стараверскія рукапісныя помнікі маюць своеасаблівую сімволіку мастацкага афармлення. Сімваламі тут выступаюць выявы птушак, ягад, шышак, выявы так званых «венецыянскіх рашотак» і інш.

У музейнай практыцы ѐсць такое паняцце, як «легенда прадмета», пад якой разумеецца гісторыя прадмета, што можа выклікаць перажыванні і эмоцыі ў наведвальнікаў. Менавіта ў сваѐй «гісторыі» ў Музеі кнігі НББ рэлігійныя кнігі раскрываюцца больш падрабязна як помнікі царкоўна-рэлігійнага жыцця грамадства і крыніцы багаслоўя. Так, «Статут царкоўны», надрукаваны Анісімам Радзішэўскім у Маскве ў 1610 г., дэманструецца ў экспазіцыі ў раздзеле «Мастацтва аправы» і прыцягвае ўвагу афармленнем аправы і буйным памерам. Цікавае гэта выданне таксама сваѐй гісторыяй. «Вока царкоўнае» – гэта свайго кшталту «царкоўна-дзяржаўная канстытуцыя», якая вызначала жыццѐ ўсіх праваслаўных расійскіх падданых. Кожнае яе новае выданне санкцыяніравалася вышэйшай царкоўнай уладай. Пасля чарговых богаслужбовых рэформаў па загадзе Патрыярха Філарэта (1633 г.) усе экзэмпляры першага друкаванага маскоўскага Статута былі канфіскаваны і спалены. З усяго накладу да сѐння па бібліяграфічных даных засталося каля 30 экз. (пры звычайным тыражы ў XVII ст. 1200 экз.). Такога кшталту «легенда» больш поўна раскрывае гісторыю рэлігійнай кнігі, яе змест і прыцягвае ўвагу наведвальніка да кнігі – музейнага экспаната. Давядзенне «легенды прадмета» да наведвальніка можа ажыццяўляцца праз афармленне яе ў выглядзе анатацыі альбо праз агучванне падчас экскурсійнага абслугоўвання і іншымі метадамі.

У Музеі кнігі НББ з хрысціянскіх канфесій прадстаўлены таксама каталіцтва і пратэстанцтва. З пратэстанцкіх выданняў – «Стары Запавет» у перакладзе на нямецкую мову Марціна Лютэра (1523), Біблія (Брэст, 1566), якая была выдадзена ў пратэстанцкай друкарні Мікалая Радзівіла Чорнага, а таксама кальвінісцкае выданне з Ашмянскай друкарні Крыстофа Дарагастайскага «Цэнзура» Салінарыуса (1615). «Стары Запавет» Марціна Лютэра ў экспазіцыі дэманструецца ў храналагічным раздзеле «Палеатыпы» і прадстаўлены як помнік еўрапейскай кніжнай культуры першай паловы XVI ст. Біблія (1566) і «Цэнзура» дэманструюцца ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тэрытарыяльна-храналагічным раздзеле «Беларускія старадрукі» і прадстаўляюць беларускую кніжную культуру XVI–XVII стст.

Сімволіка рэлігійных кніг у экспазіцыйных раздзелах «Рукапісы беларускага паходжання» і «Беларускія старадрукі» вельмі дакладна адлюстроўвае ўласцівыя беларускай культуры полікультурнасць, шматмоўнасць і рознасць веравызнанняў. Шматэтнічнасць і поліканфесіянальнасць абумовілі напісанне рукапіснай кнігі рознымі алфавітамі і на розных мовах. Так, у экспазіцыі дэманструецца мусульманскі Кітаб – рукапіс беларускіх татараў, напісаны на беларускай мове арабскай графікай. У раздзеле «Беларускія старадрукі» дэманструюцца кнігі розных рэлігійных канфесій (праваслаўныя, каталіцкія, пратэстанцкія, уніяцкія) на розных мовах (старабеларускай, царкоўнаславянскай, польскай, лацінскай). Акрамя моўнай сімволікі рэлігійная кніга Беларусі розных гістарычных этапаў мае характэрную сімволіку шрыфту і мастацкага афармлення старадрукаў. Як піша ў сваёй кнізе «Гісторыя мастацтва і дойлідства Беларусі» Сяргей Харэўскі, «у сваім развіцці беларуская графіка прайшла праз усе стылі, якія вядомы ў мастацтве…» [5, с. 63]. Гэта выразна адлюстроўвае экспазіцыя Музея кнігі НББ. Рэнесанс прадстаўлены кнігамі Францыска Скарыны, готыка – Бібліяй (1566), маньерызм – Евангеллем Пятра Мсціслаўца, барока – кнігамі магілёўскай школы гравюры канца XVII ст. і інш.

*Такім чынам, экспазіцыя Музея кнігі НББ дазваляе:*

– пазнаёміцца з рэлігійнай кнігай розных канфесій і гістарычных этапаў, яе тэматычнай, моўнай разнастайнасцю, асаблівасцямі мастацкага афармлення;

– азнаёміцца з рэлігійнай кнігай Беларусі, яе поліканфесіянальнасцю, шматмоўнасцю і разнастайнасцю мастацкага выканання;

– прадэманстраваць характэрнае для беларускага этнасу мірнае суіснаванне розных веравызнанняў;

– сфарміраваць павагу ў наведвальнікаў музея да розных рэлігій і рэлігійных культур;

– выхаваць талерантнасць да шматлікіх рэлігійных канфесій;

– абудзіць цікавасць да рэлігіі, рэлігійнай культуры, да гісторыі развіцця, фарміравання і станаўлення рэлігійных кірункаў.

1. *Николаева Н.* Музейная экспозиция как художественная структура // Искусство музейной экспозиции : сб. ст. / НИИ культуры ; сост. Т. К. Стриженова. – Москва, 1977. – С. 65–94.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. *Арзамасцев В. П.* О семантической структуре музейной экспозиции // Музееведение. На пути к музею XXI века : сб. науч. тр. / АН СССР, НИИ культуры ; редкол.: Н. А. Никишин [и др.]. – Москва, 1989. – С. 35–49.

3. *Юренева Т. Ю.* Музееведение : учебник для гуманитар. специальностей вузов. – Москва : Акад. Проект, 2003. – 558 с.

4. *Самайлюк Т. А.* Да пытання тыпалогіі рэлігійнай кнігі // Матэрыялы Першых кнігазнаўчых чытанняў (Мінск, 15 верасня 1998 г.) / склад. Т. І. Рошчына. – Мінск : НББ, 2000. – С. 35–39; *Самойлюк Т. А.* Функциональная сущность и свойства религиозной книги // Матэрыялы Трэціх Міжнар. кнігазнаўчых чытанняў «Кніга Беларусі: повязь часоў» (Мінск, 16–17 верасня 2003 г.) / склад. Т. І. Рошчына. – Мінск : НББ, 2005. – С. 105–117.

5. *Харэўскі С. В.* Гісторыя мастацтва і дойлідства Беларусі. – Вільня : Еўрапейскі гуманітарны ўніверсітэт, 2007. – 238 с., [18] л. іл.

## Summary

*T. Sapega.* ***The religious book in the exposition of the Book Museum of the National Library of Belarus***

The religious book in its broadest definition, belonging to different faiths, is an exposition object of the Book Museum of the National Library of Belarus and presented it as a monument of literary culture, the work of book art. The article describes the Museum individual copies belonging to different religious traditions of the Belarusian multifaith and multiethnic culture.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ